**В.Э. Зіманскі** (Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава)

## ДАДАНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА Ў ПОМНІКАХ СТАРАБЕЛАРУСКАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ XIII – ПАЧ. XVI СТ.

Вывучэнне гісторыі развіцця беларускай мовы самым цесным чынам звязана з вывучэннем мовы асобных помнікаў старабеларускай пісьменнасці, што дазваляе ўявіць стан, кірункі развіцця літаратурнай мовы, паглыбіць уяўленні аб яе тыповых адметнасцях. Помнікі беларускай пісьменнасці – асноўная і таму важная крыніца вывучэння старабеларускай мовы, высвятлення шляхоў станаўлення і фарміравання яе асноўных сінтаксічных асаблівасцей [1, с. 35]. Асабліва важным з'яўляецца сістэмны аналіз мовы ўсіх вядомых помнікаў старабеларускай пісьменнасці, бо яны ўтрымліваюць багаты фактычны матэрыял для вывучэння гістарычнага развіцця беларускай мовы, у тым ліку і яе сінтаксічнага ладу.

Мэта гэтага артыкула – вызначэнне стану і асаблівасцей развіцця сінтаксісу старабеларускай мовы на ўзроўні даданых членаў простага развітага няўскладненага сказа на матэрыяле помнікаў старабеларускай пісьменнасці. Крыніцамі даследавання паслужылі помнікі старабеларускай пісьменнасці, якія ахопліваюць перыяд XIII – пач. XVI ст., такія як: Дагаварная грамата смаленскага князя Мсціслава Давыдавіча з Рыгай і Гоцкім берагам 1229 г.; Жыціе Ефрасінні Полацкай XIII ст.; Дагавор Полацка з Рыгай 1330 г.; Дагавор Полацка з Рыгай 1407 г.; Грамата палачан у Рыгу 1465 г.; Укладная грамата княгіні Ульяны царкве ў Азярышчах 1377г.; Даравальная грамата князя Андрэя Полацкаму манастыру 1399 г.; Прывілей Ягайлы 1387 г.; Грамата караля Уладзіслава Скіргайлу 1387 г.; Вісліцкі статут 1347 г.; Судзебнік Казіміра 1468 г.; Статут 1529г.; Жыццё літоўскіх (віленскіх) пакутнікаў к. XIV ст.; Аповесць пра трох каралёў к. XV ст.; Пакуты Хрыста к. XV ст.; Александрыя XV ст.; Аповесць пра Баву XVI ст.; Летапіс вялікіх князёў літоўскіх 1430 г.; Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.; Хроніка Быхаўца XVI ст. і інш.

Просты развіты няўскладнены сказ у старабеларускай мове, як і ў сучаснай, – гэта сказ, які мае даданыя члены – азначэнне, дапаўненне і акалічнасць. Спынімся на аналізе тыповых асаблівасцей семантыка-сінтаксічных адносін і спосабах выражэння сінтаксічных сувязей пры ўжыванні даданых членаў. Найбольш распаўсюджанымі відамі сінтаксічных сувязей пры выражэнні азначэння і дапаўнення ў старабеларускай мове як мове з добра развітымі сістэмамі іменных флексій з'яўляецца дапасаванне і кіраванне. Тыповымі відамі сінтаксічнай сувязі пры выражэнні акалічнасці з'яўляюцца прымыканне і кіраванне.

Асаблівасці выражэння азначэння. Асноўным спосабам выражэння азначэння ў разглядаемы перыяд было выражэнне праз дапасаваны член сказа. Такая сувязь характарызавала залежнасць ад паяснёнага слова прыметніка, займенніка, дзеепрыметніка, якія суадносіліся з ім у родзе, ліку, склоне. Пры гэтым тыпе сінтаксічнай сувязі пераважалі іменныя канструкцыі: паяснёнае слова выражана пераважна назоўнікамі адзіночнага і множнага ліку; сярод азначэнняў у помніках XIII-XIV стст. нязначна пераважаюць прэпазіцыйныя дапасаваныя азначэнні: *лифл#нскага" рать, четвьртое лhто, велика# дорога, божии дни, лотыгольска# земл#, немецьки гость, готьскы берегь, старый мир, нашъ монастыри, крестное целование, лишнее дhло, друга# жена, руская земл#, непріятельска# земл#, каждый дубъ, чюжій гай, велики кн#зь, своею радою, пречітстага" матерь*; але: *недостаткы велики, ратманы ризкие, любовь ваша, епіскупа полотьского, кн#зь смоленьскыи, земл# первописаная, з винами пречерными.* Постпазіцыйнае размяшчэнне азначэння характэрна ў асноўным помнікам дзелавога і рэлігійнага стыляў, дзе гэта абумоўлена тэрміналагізацыяй выразаў (у першых) ці кніжным характарам мовы помніка перакладнога паходжання (або стылізацыяй пад

Репозиторий ВГУ

яе – у другіх). У помніках XV-пач. XVI ст. сітуацыя кардынальна не мяняецца ні ў дачыненні да стылю помніка, ні ў дачыненні да агульных колькасных паказчыкаў ужывання прэпазіцыйных і постпазіцыйных дапасаваных азначэнняў: *почестливым суседомъ*, *моимъ листомъ*, *доброго человека*, *пъяных людеи*, *по старому праву*, *по старой пошлинh*, *боярскыи люди*, *земное дhло*, *вhчную отчизну*, *вhчными границами*, *заволаная воина*, *вhрная рада*, *королевскымъ приказаньем*, *нашой присязh*, *потребизны земскоh*, *чорными людьми*; але: *на вhкы вhчныя*, *дhла городские*, *дворяне городские, поклон при"телскыи*, *посполства полоцкого*, *бояринъ ошменьскии*, *дhтем ближним*, *печать свою*, *село суседово*, *держаца слонимски*, *грошеи широких*, *грамота хрестная*, *мештерем задвиньскимь*, *сыновца милого*.

Для простага развітага сказа разглядаемага перыяду характэрны таксама недапасаваныя азначэнні, выражаныя прыназоўнікавымі і беспрыназоўнікавымі формамі роднага склону са спосабам сінтаксічнай сувязі кіраванне: *приказан~м корол#*, *двор#не кн#з#*, *дhло знаменитыхъ*, *нашелъ дерево безъ пчол, скрын# подъ ключами.*

Помнікі пісьменнасці XV-пач. XVI ст. адлюстроўваюць пашырэнне ўжывання прыдатка як разнавіднасці дапасаванага азначэння: *писана пану буръмистру*, *кухмистру князя; блаженыи Григории патриархъ*; *великий князь Витовт; бояринъ ошменьски Янко Богданович, кн#зь печатник Федоровъ.*

Асаблівасці выражэння <u>дапаўнення і акалічнасці.</u> Дапаўненне як член сказа ў старабеларускай мове характарызавала залежнасць імя ад дзеяслова (ці іншай часціны мовы), абазначаючы аб’ект (зрэдку – суб’ект) дзеяння. Выражалася дапаўненне пры дапамозе сінтаксічнай сувязі кіраванне, якое магло быць прыназоўнікавым і беспрыназоўнікавым (яно з'яўляецца першасным). Асабліва шырока распаўсюджаны беспрыназоўнікавыя дапаўненні ў канструкцыях з давальным склонам залежнага слова, дзе дапаўненне выражана назоўнікам ці асабова-ўказальным займеннікам і абазначае аб’ект (*клан#юс# дhтемъ*, *р#дите игемену*, *поклонъ кн#зю*, *выдаи разбоинику*, *рекли Прокопии*, *реклh Фредерику, немцhмъ дати*) і суб’ект дзеяння (*иметъ пану*, *намъ плитити*, *годиться государю, судить ему, держ#ть кановникомъ*, *местит gми*, *вамъ чинити*). Прыназоўнікавыя дапаўненні тут параўнальна рэдкія і выражаюцца ў асноўным формамі з прыназоўнікам *к*: *привhсил к запису*.

Дапаўненне, выражанае формай вінавальнага склону залежнага слова, у старабеларускіх помніках пісьменнасці магло быць ускосным (выражана прыназоўнікавымі формамі): *пригодилос# за грhхы, идуть на воину, бирес# про колоколъ, повели у полонъ*, *ити q рать, писанъ у четвергъ, во тму ехати, переступати через границу*, *побравши на сани*, *дати за даръ*, *обернути на лhпшее*, *дати на рукоемство*, *на помочь прихwдила* – і прамым (выражана беспыназоўнікавымі формамі): *неправду дh"лъ, даите исправу, искали колокола, положилъ еуангелье, вз#лъ мечъ, стратить дhлницу, переступить приказанье, шкоду платити, дерево зрубить, даемъ вhданье, имhеть вину, раны платить, вердунки маетъ, украдетъ дуб, соль вhсити, платити татбу, пограбилъ вhдаючи убиство, маемъ листъ, крестъ цhловати, "зыкъ пускати.* Дапаўненні, выражаныя адушаўлёнымі назоўнікамі або асабова-ўказальным займеннікам, у позні перыяд пераважна ўжываюцца ў форме вінавальнага склону, якая супадае з формай роднага склону: *wпытати светков*, *побили служебных*, *посылалъ пословъ*, *мучити чловека, чтучи его*, *держалъ его*, *выдаі разбоініка, поиметь жону.*

Прыназоўнікавыя формы роднага склону маглі ўжывацца як для выражэння дапаўнення (у асноўным пры дзеясловах фізічнага ці разумовага дзеяння і руху), так і для выражэння акалічнасці (часу, месца, меры і ступені); параўн. канструкцыі з прыназоўнікамі *отъ*: *qн#лос# ^ нарожень#*, *берутъ отъ отца; до*: *пришодши до стаини*, *заразилъ до смерти; по*: *по селищомъ шкодять.* Беспрыназоўнікавыя



Репозиторий ВГУ

канструкцыі з адмоўем *не* і са значэннем часткі цэлага: *куници не брати, вѣсить соли, не брали дѣлницы, продалъ мехъ соли*, *береть жыта* ўжываюцца ў функцыі прамога дапаўнення.

Сінтаксічная функцыя дапаўнення або акалічнасці характэрна канструкцыям з формай творнага склону залежнага слова, які ўжываўся са значэннем прылады дзеяння (функцыя дапаўнення), сумеснасці дзеяння, сукупнасці (радзей – лакалізацыі месца дзеяння) (функцыя акалічнасці); параўн. канструкцыі з прыназоўнікам *со (зъ)*: *поведали со жалqбою, дати грамоту съ печатью, выдалъ со двором, торговати со гостемь, миръ со Пьсковомъ*, *пришодши с людми*, *взяти землю зъ бортью* – і прыназоўнікам *под: лежу подъ оконцомъ*, *стати ратью подъ городомъ.* Беспрыназоўнікавыя формы творнага склону выступаюць у функцыі дапаўнення, абазначаючы прыладу дзеяння, функцыі акалічнасці, абазначаючы спосаб дзеяння, або ў прэдыкатыўнай функцыі, абазначаючы асобу-суб'екта дзеяння: *бил чолwм*, *меновалис# кордом*, *бывал вр#дникомъ*.

Толькі ў фукнкцыі акалічнасці, якая абазначала месца, час, спосаб, умову, прычыну, меру і ступень дзеяння, ужываліся прыназоўнікавыя канструкцыі з месным склонам кіруемага слова; асноўныя значэнні – месца, абставіны ажыццяўлення дзеяння і лакалізацыя падзей у часе: *на своѣмъ месте сѣдети, в городе правити, покелепани на рѣзне, вѣсити на скалвахъ, пиюче q пиру, были на сqде, выдати по исправѣ, створило в розмирье, сто"ли q дворе, имѣть при лесе, дати (дѣтемъ) у молодости, крадуть въ ночи.*

Асноўны спосаб выражэння акалічнасці ў старабеларускім простым сказе – канструкцыі з сінтаксічнай сувяззю прымыканне, пры якім залежнае слова, выражанае пераважна прыслоўем, звязваецца з галоўным, выражаным дзеясловам, толькі па сэнсе. Сярод помнікаў пісьменнасці XIII-XIV стст. пераважаюць дзеяслоўна-прыслоўныя словазлучэнні – гэта акалічнасці часу, месца, спосабу дзеяння: *после придуть, сто#ло непорушено*, *сыймавались здавна*, *заутра забить, купит доброволно*, *уверху писано, потреба знати*.

Трэба адзначыць, што помнікі пісьменнасці XV - пач. XVI ст. адлюстроўваюць утварэнне на базе дзеепрыметнікаў незалежнага стану нязменнай формы дзеяслова – дзеепрыслоўя, якое пачало ўжывацца побач з прыслоўем у якасці акалічнасці: *погодивши лежу*, *qслышит чтучи*, *кладут присягнувши*.

**Такім чынам,** у перыяд XIII - пач. XVI ст. у старабеларускай пісьменнасці найбольш распаўсюджанымі відамі дадаеных членаў сказа з'яўляюцца дапасаваныя азначэнні, ускосныя і прамыя дапаўненні і акалічнасці часу, месца і спосабу дзеяння. Помнікі пісьменнасці адлюстроўваюць працэс пашырэння прыдатка як віда дапасаванага азначэння, распаўсюджання прыназоўнікавых форм ускосных дапаўненняў, замацавання за формамі роднага склону пры ўжыванні адмоўя *не* і пры абазначэнні часткі цэлага функцыі прамога дапаўнення. Адушаўлёныя назоўнікі ў вінавальным склоне ў функцыі прамога дапаўнення к канцу разгладаемага перыяду маюць форму, якая супадае з формай роднага склону, што сведчыць пра канчатковае замацаванне граматычнага выражэння катэгорыі адушаўлёнасці.

### Літаратура


1. Рапацэвіч, С.Я. Формы выражэння простага дзейніка ў старабеларускай мове / С.Я. Рапацэвіч // Бел. лінгвістыка. – 2001. – Вып.51. – С.35-41.


Репозиторий ВГУ